ВЕДАЙ НАШЫХ!

# Адзінаццацікласнікі не ўпусцілі свой шанц

Працяг. Пачатак у нумары за 23 мая.

**Працягваем знаёміць чытачоў «МГ» з пераможцамі заключнага этапу рэспубліканскай алімпіяды па 18 школьных прадметах. Нагадаем, што сёлета ён праводзіўся толькі сярод адзінаццацікласнікаў. Пяцёра нашых юных разумнікаў атрымалі дыпломы, а разам з імі і шанц без вынікаў ЦТ быць залічанымі ў профільныя ВНУ.**

## Кірыл РУДЫ: «У «суровыя рабочыя будні» ў мяне па дзве трэніроўкі на дзень»

Сёлетняя алімпіяда па фізічнай культуры і здароўі – другая за ўсю гісторыю. Адметна, што летась абласны і рэспубліканскі этапы праходзілі на базе нашай СШ №14. У гэтым годзе мацнейшыя ў рэспубліцы юныя спартсмены спаборнічалі ў Гродне.

Кірыл Руды, адзінаццацікласнік СШ №14, заваяваў дыплом II ступені. З першага класа Кірыл займаецца плаваннем, ён кандыдат у майстры спорту, неаднаразовы прызёр рэспубліканскіх, абласных спаборніцтваў. За кожнай яго перамогай – вялікая праца, самадысцыпліна. Кірылу ёсць з каго браць прыклад: яго тата Андрэй Аляксандравіч у свой час прафесійна займаўся баскетболам. Хлопец расказвае, што ў «суровыя рабочыя будні» ў яго па дзве трэніроўкі на дзень, першая пачынаецца ў 6.40 раніцы. Ён з удзячнасцю называе імёны сваіх трэнераў Алены Руткоўскай і Людмілы Гілевіч. На жаль, на алімпіядзе Кірылу не давялося прадэманстраваць свае дасягненні па плаванні: гэты від спорту адмянілі з-за эпідэміялагічнай абстаноўкі. Аднак усе фізічныя якасці – гібкасць, хуткасць, сілу – раскрыў у поўнай меры. Бег, скачкі, падцягванне, комплекс спартыўных гульняў (валейбол, баскетбол, футбол, гандбол) і многае іншае ўваходзіла ў праграму алімпіяды. Усё гэта патрабавала вялікай падрыхтоўкі, поўнай аддачы. Дапамагаў Кірылу вопытны педагог, кіраўнік фізічнага выхавання СШ №14 Уладзімір Лашук, які падрыхтаваў дзясяткі спартсменаў, прывіў навыкі здаровага ладу жыцця многім сваім вучням.



Кірыл Руды і яго педагог Уладзімір Лашук.

Акрамя таго, на алімпіядзе была тэарэтычная частка з пытаннямі па гісторыі алімпійскіх гульняў, здаровым ладзе жыцця і г.д. Падрыхтавацца да яе дапамагла Кірылу настаўнік-метадыст СШ №9 Алена Віктарава. Складанасць заключалася ў тым, што па гэтым прадмеце няма падручнікаў, трэба самому шукаць інфармацыю, збіраць яе па крупінках з розных крыніц.

Кірыл збіраецца паступаць у Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізкультуры і спорту на факультэт аздараўленчай фізічнай культуры. Магчыма, будзе, як і яго педагог, выкладаць у школе фізічнае выхаванне ці стане інструктарам па адным з відаў спорту.

## Кацярына КАЖУРА: «Хачу выкладаць геаграфію ў ВНУ і складаць заданні алімпіяды»

Амбіцыйныя планы сёлетняй выпускніцы гімназіі №6 Кацярыны Кажура маюць пад сабой трывалую глебу. Яе веды па геаграфіі даўно выходзяць за рамкі школьнай праграмы. Сведчанне таму – дыплом III ступені на заключным этапе рэспубліканскай алімпіяды па гэтым прадмеце, што праходзіў у Дзяржынску.



Перш чым адправіцца ў падарожжы ў іншыя краіны, Кацярына Кажура хоча дасканала вывучыць родную Беларусь.

Каця расказвае, што заданні іспытаў, як і ў мінулыя гады, складаліся з некалькіх этапаў. Найбольш складаныя – практычныя, з выхадам на мясцовасць, стварэннем праекта.

— У нас сабралася выдатная каманда географаў, як абласная, так і рэспубліканская! Здавалася б, мы саперніकі, а на самай справе сталі сябрамі. У нас вельмі цёплыя адносіны. І за гэта я ўдзячная алімпіядзе! – гаворыць пераможца.

Дарэчы, у камандзе Мінскай вобласці Кацярына была адзінай прадстаўніцай прыгожай паловы чалавецтва.

Дзяўчына жыве ў Насілаве, з першага класа штораніцы ездзіць у гімназію №6. Гаворыць, што гэта зусім няцяжка. У мінулыя гады Кацярына паспявала яшчэ і займацца танцамі ў цэнтры творчасці дзяцей і моладзі «Маладзік». Яна расказвае, што ў сярэдніх класах захаплялася беларускай мовай, аднак вырашыла засяродзіцца на геаграфіі, якую на той час ведала горш.

Яе заўсёды падтрымлівала, дапамагала рыхтавацца да алімпіяды настаўніца геаграфіі Людміла Разанава – таленавіты педагог, які ўмее зацікавіць вучняў сваім прадметам. Людміла Антонаўна падрыхтавала цэлую плеяду пераможцаў рэспубліканскай алімпіяды, якія ўслед за ёй сталі географамі.

Вось і Кацярына ўжо сёння можа лічыць сябе студэнткай геаграфічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта.

На пытанне, у якіх краінах марыць пабываць, дзяўчына адказала, што ў першую чаргу хоча дасканала вывучыць родную Беларусь. А потым адправіцца ў далёкія краіны, якія прыцягваюць найбольш – у Паўднёвую Карэю, Японію, Канаду, Злучаныя Штаты Амерыкі...

## Ксенія БРЫЛЬ: «Дома мы стараемся размаўляць па-беларуску»

У гэтым заключаецца значны складальнік поспеху адзінаццацікласніцы СШ №1 імя Янкі Купалы Ксеніі Брыль: яна валодае роднай мовай з дзяцінства. Любоў да яе дзяўчынцы прывілі бацькі Іна Валянцінаўна і Валерый Пятровіч. Любімы пісьменнік Ксеніі – Уладзімір Караткевіч. Яна лічыць, што кожны беларус павінен прачытаць «Каласы пад сярпом тваім», «Дзікае паляванне караля Стаха».

Цікавіцца дзяўчына і гісторыяй Беларусі, любіць музыку, закончыла дзіцячую школу мастацтваў па класе фартэпіяна.

З шостага класа беларускую мову і літаратуру ў Ксеніі выкладае Інеса Ліс.

— Ксенія адказная, сумленная, мэтанакіраваная, — так характарызуе вучаніцу настаўніца, якая на працягу 22 гадоў адкрывае дзецям хараство роднай мовы.

Вялікае шчасце для педагога — адчуць патэнцыял вучня, развіць яго здольнасці і бачыць, як ён расце, павышае ўзровень ведаў. А нярэдка і звязвае з любімым прадметам будучую прафесію.

Да слова, у мінулым годзе Ксенія Брыль выступіла на рэспубліканскім этапе з такім жа вынікам — як і сёлета, атрымала дыплом III ступені. Калі летась знаўцаў роднай мовы збіралі ў Магілёве, то сёлета – у Маладзечне. А дома, як вядома, і сцены дапамагаюць. Дзяўчына расказвае, што алімпіяда праходзіла ў два этапы: трэба было падрыхтаваць водгук на літаратурны твор, выканаць 10 заданняў комплекснай работы.

— Ксенія можа ўжо сёння лічыць сябе студэнткай! — з гордасцю гаворыць Інеса Анатольеўна.

— Так, я выбрала профільную ВНУ: філалагічны факультэт Белдзяржуніверсітэта. Хачу вывучаць беларускую і славянскую філалогію, — пацвярджае пераможца.

**Анжаліка КРУПЯНЬКОВА.**
**Фота: Віталій КРУПЯНЬКОЎ, архіў Кацярыны КАЖУРА.**



нка Купала, імя якога носіць СШ №1, мог бы ганарыцца поспехамі Ксеніі Брыль у вывучэнні роднай мовы.